УДК 378.1

***З.П. Мельнікава***

# АСВЕТНА-КУЛЬТУРНЫЯ ТРАДЫЦЫІ ФІЛАЛАГІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА Ў КАНТЭКСЦЕ СУЧАСНЫХ ГУМАНІТАРНЫХ СТРАТЭГІЙ

Філалагічны факультэт – адзін са старэйшых і аўтарытэтных факультэтаў нашай установы, у межах якога ў свой час былі запачаткаваны два іншыя – гістарычны і факультэт замежных моваў. Дасягненні прафесарска-выкладчыцкага і студэнцкіх калектываў з году ў год значныя, вядомыя не толькі ў нашым універсітэце, але ва ўсіх гуманітарна-філалагічных і педагагічных сферах і асяродках Беларусі. Я з задавальненнем падкрэслю, што ні ў адным універсітэце нашай краіны, акрамя Брэсцкага, няма такога філфака, дзе б ствараліся нацыянальныя падручнікі і праграмы, над чым вось ужо каля пятнаццаці год напружана і вынікова працуе калектыў літаратуразнаўцаў і метадыстаў факультэта.

Асветна-культурныя традыцыі факультэта закладзены нашымі настаўнікамі, старэйшымі сябрамі. Слугаванню асвеце, філалогіі, Бацькаўшчыне прысвяцілі сваё жыццё У.А. Калеснік, Я.А. Чарняўская, Г.М. Малажай, А.А. Майсейчык, В.Я. Зарэцкая-Ляшук, І.А. Шумская, М.П. Лукашук, В.М. Емельяновіч і іншыя, якія для сённяшніх студэнтаў сталі ўзнёслымі і прыгожымі легендамі. Яны ўзнялі філалагічна-адукацыйную навуку на высокі прафесійны ўзровень.

Гістарычна-знакавай падзеяй для развіцця і станаўлення навукова-філалагічнай навукі і асветна-культурнай прасторы ў нашай навучальнай установе стаў факт, асабліва важны на той час для рэгіянальнага педінстытута ў Брэсце, што ў 1983-м годзе першым яго прафесарам стаў вучоны-гуманітарый, літаратуразнаўца Уладзімір Калеснік. Больш за трыццаць год (з 1954 па 1988 гг.) ён кіраваў кафедрай беларускай літаратуры, сваім навукова-прафесійным аўтарытэтам уплываў на станаўленне беларускай філалогіі не толькі на факультэце, а ўвогуле на Беларусі. Яго навукова-літаратурныя публікацыі, манаграфіі-даследаванні «Паэзія змагання» ( 1959 г.), «Час і песні» (1962 г.), «Зорны спеў» (1975 г.), «Ветразі Адысея» (1977 г.) былі выдатным прыкладам для калег і ўзорам для шматлікіх вучняў ужо ў 1950–1970-ыя гады. Як асоба, як навуковец, як выбітны асветнік і культурны дзеяч У. Калеснік вызначальна ўплываў на пашырэнне гуманітарнай сферы ва ўніверсітэце, у горадзе Брэсце і ва ўсім Берасцейскім рэгіёне. Яго пазнейшыя літаратурна-даследчыя кнігі «Лёсам пазнанае», «Тварэнне легенды», «Усё чалавечае» і некаторыя іншыя сталі для ўсяго айчыннага літаратуразнаўства 80–90-х гадоў XX ст. узорам навуковай і метадалагічнай кампетэнтнасці. Пры прафесійнай і маральнай падтрымцы У. Калесніка следам за ім філолагамі-беларусазнаўцамі сталі яго маладзейшыя калегі і вучні – А.А. Майсейчык, Г.М. Малажай, В.Я. Зарэцкая, Ц.Б. Ліякумовіч, В.М. Емельяновіч, У.А. Лебедзеў, Ю.В. Паталкоў. Прафесар Уладзімір Калеснік стаў заснавальнікам першай навуковай гісторыка-літаратуазнаўчай школы на філалагічным факультэце. У 1980 – 1990-ыя гады склаліся навуковыя школы яго вучняў: літаратурна-метадычная пад кіраўніцтвам прафесара В.Я. Зарэцкай і лінгва-дыдактычная пад кіраўніцтвам прафесара Г.М. Малажай.

Набыткі навуковых філалагічных школ Брэсцкага ўніверсітэта прызнаныя і высока ацэнены на дзяржаўным узроўні. Калектыў выкладчыкаў-літаратараў неаднойчы станавіўся пераможцам рэспубліканскага конкурсу «Нацыянальны падручнік» на стварэнне праграмаў і вучэбных дапаможнікаў па беларускай

літаратуры, што сведчыць пра неаспрэчную прафесійнасць, высокую кваліфікацыю іх аўтараў. Выкладчыкі-філолагі факультэта па даручэнні Міністэрства адукацыі яшчэ ў 1990-ыя гады стварылі цэлыя вучэбна-метадычныя комплексы па роднай літаратуры для вучняў і настаўнікаў школ Беларусі. Зараз працягваецца супрацоўніцтва аўтарскага калектыву з Нацыянальным інстытутам і Міністэрствам адукацыі па далейшым забеспячэнні агульнаадукацыйных устаноў Беларусі неабходнымі вучэбна-метадычнымі выданнямі па беларускай літаратуры. У хуткім часе будзе закончана падрыхтоўка метадычных дапаможнікаў для настаўнікаў «Беларуская літаратура ў 10 класе» і «Беларуская літаратура ў 11 класе», якія з грыфам Мінадукацыі будуць выдадзены ў 2011 годзе. Поспехі і дасягненні сённяшняга прафесарска-выкладчыцкага калектыву сведчаць аб трываласці гуманітарна-асветных традыцый, закладзеных старэйшым пакаленнем навукоўцаў філфака, аб усведамленні адказнасці кожным выкладчыкам за нястомнае павышэнне кваліфікацыі, навукова-дасканалае валоданне прафесіяй.

Азіраючыся на пройдзеныя філфакам этапы станаўлення за 65 год і спрабуючы аналізаваць прычыны і ўмовы набыцця статусу высокакваліфікаванага прафесарска-выкладчыцкага калектыву, неабходна асабліва падкрэсліць, што акрамя асноўнай місіі – якаснай падрыхтоўкі настаўнікаў-філолагаў, педагогаў, гуманітарыяў, лінгвістаў і літаратуразнаўцаў – факультэт стаў знаным у рэспубліцы навукова-асветным і гуманітарным асяродкам.

Паспяховай вучобе, выхаванню грамадзянскасці, любові да прафесіі, цікавасці да шырокіх гуманітарных ведаў многіх пакаленняў студэнцкай і вучнёўскай моладзі спрыяе эфектыўная сістэма ідэйна-выхаваўчай, асветна-культурнай працы, якая творча рэалізуецца праз супрацоўніцтва выкладчыцка-кафедральных калектываў з органамі студэнцкага самакіравання, з перадавымі настаўнікамі-прадметнікамі Берасцейшчыны, з раённымі аддзеламі адукацыі вобласці. Ужо традыцыйным стала правядзенне штогадовых міжнародных студэнцкіх навуковых канферэнцый, выданне па іх выніках зборнікаў навуковых прац маладых філолагаў. Многія рэспубліканскія і міжнародныя канферэнцыі, што арганізуюцца і праводзяцца кафедрамі, таксама прадугледжваюць працу студэнцкіх навуковых секцый. Выкладчыкі факультэта ставяць мэту зацікавіць таленавітую моладзь даследчыцкай працай і далучыць да філалагічных, педагагічных навук.

Эфектыўна і ў вялікім аб'ёме праводзіцца асветна-выхаваўчая і прафарыентацыйная праца пры факультэцкіх «Рускім цэнтры», навуковым цэнтры імя У. Калесніка, вучэбнай фальклорна-краязнаўчай лабараторыі. Гэта стала красамоўным працягам гуманітарных традыцый, закладзеных вучонымі-асветнікамі ў 1970–1980-ыя гады. Па-ранейшаму, на мой погляд, важную, а часта і вызначальную ролю ў жыцці і працы калектыву адыгрывае асоба выкладчыка, які сам павінен быць прыкладам Настаўніка, вучонага, творцы для сучаснай моладзі. Філалагічнаму факультэту ў гэтых адносінах шанцуе: па волі лёсу з 1996-га года на факультэце працуе Мікола Мішчанчук, вядомы беларускі літаратуразнаўца, педагог-метадыст, крытык, паэт, перакладчык, аўтар і сааўтар шматлікіх манаграфій, кніг, артыкулаў, падручнікаў для вучняў сярэдняй школы, студэнтаў-філолагаў, настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры. Прафесар М. Мішчанчук пасля пераезду з Мінска ў Брэст хутка стаў аўтарытэтным і вартым прыкладам для калег, любімым выкладчыкам брэсцкіх студэнтаў, арганізатарам многіх навуковых форумаў высокага рангу, паспяховай навукова-даследчай працы. Ён з'яўляецца навуковым кіраўніком многіх магістрантаў і аспірантаў Брэсцкага ўніверсітэта і некаторых іншых ВНУ нашай краіны. На філалагічным факультэце з другой паловы 1990-ых гадоў прафесар М. Мішчанчук працягвае навукова-арганізацыйную дзейнасць, асновы якой былі закладзены

У. Калеснікам, В. Ляшук-Зарэцкай, Г. Малажай, Ц. Ліякумовічам, А. Майсейчыкам. З асобай М. Мішчанчука, яго навукова-даследчай, вучэбна-метадычнай дзейнасцю на факультэце паболела ўніверсітэцкага акадэмізму, прафесійнай філалагічнай дасведчанасці і грунтоўнасці. Менавіта пад кіраўніцтвам прафесара М. Мішчанчука на факультэце на працягу пяці год працаваў адзіны ў Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А.С. Пушкіна Савет па абароне кандыдацкіх дысертацый, а яго членамі былі выкладчыкі-літаратуразнаўцы факультэта. Вучні і паслядоўнікі прафесара М. Мішчанчука сёння ў пераважнай большасці сталі кандыдатамі філалагічных навук, дацэнтамі і паспяхова працуюць у нашым універсітэце. Гэта С. Шчэрба, Вал. Смаль, Л. Скібіцкая, Н. Дамброўская, К. Сальнікава.

Як вядома, навуковая школа – гэта не толькі вызначанае кола праблем, якія глыбока распрацоўваюцца асобным вучоным і яго навуковым калектывам. Школа – гэта вучні і наступнікі, якія годна працягваюць справу настаўнікаў. Нашыя філалагічныя дасягненні мацуюць і памнажаюць аўтарытэт роднага Брэсцкага ўніверсітэта, а яшчэ, што вельмі важна, разбураюць стэрэатыпнае ўяўленне аб правінцыйнай вну і ўзроўні развіцця ў ёй навукі.

На жаль, мы сёння перажываем час, калі гуманітарныя навукі, мякка кажучы, запатрабаваныя не ў першую чаргу, хоць многа гаворыцца аб гуманізацыі ўсіх сфер грамадскага жыцця, і найперш – адукацыйнай. Яна, несумненна, павінна мець сацыякультурную мадэль і адкрываць мгчымасці для шырокай гуманітарнай падрыхтоўкі студэнтаў. Аднак часта мы бачам, як гуманітарна-адукацыйнай сферы зусім неапраўдана прапаноўваюцца вытворчыя, тэхнакратычныя падыходы.

У канцы 1980-х гадоў на сустрэчы з берасцейскай моладдзю ў аблвыканкаме У.А. Калеснік паставіў пытанне: «На якім станку робіцца сумленне, пачуццё ўласнай годнасці, гуманістычная ўражлівасць ці хоць бы сціпласць і ветлівасць?..» І сам адказаў: «Такім цудоўным станком з’яўляюцца зносіны. На гэтым станку мы якраз і працуем, і той факт, што мы слухаем адны другіх, не абражаем… доказвае плённасць нашай працы па абнаўленні душ, вызваленні ад няведання, нецярпімасці».

Філфак, як ніякі іншы факультэт універсітэта, балюча адчувае і перажывае рэфармаванне школы, разбуральныя наступствы дзяржаўнага двухмоўя, якое, на жаль, часта ператвараецца ў рускае аднамоўе. Я пераканана, што час неабачліва перакошаных адносін да беларусазнаўства, філалогіі, як увогуле гуманітарных навук, павінен закончыцца. Заўсёды, нават у застойныя савецкія часы, гуманітарыі, як і ўсе вучоныя, шанаваліся. На розных узроўнях ствараліся спрыяльныя ўмовы для развіцця гэтых навук. Ніколі раней грамадства не сумнявалася, што гуманітарыі працуюць на будучыню, фарміруючы светапогляд і светаразуменне пакаленняў моладзі. Пытанні, як выхаваць новыя годныя пакаленні (бо якімі яны будуць, такой будзе і Беларусь), як планаваць будучыню, як выйсці на дабрыню і стваральнасць з драматычнай жыццёвай і грамадскай сітуацыі, паняцці патрыятызму, ахвярнасці, грамадзянскасці, высакароднасці – не такія ўжо і абстрактныя. І найперш гуманітарыі нясуць за гэта высокую адказнасць перад будучыняй.

Мяжа стагоддзяў і пачатак новага, XXI стагоддзя сталі эпохай глабалізацыі, што, на жаль, прывяло да адхілення на другі план культурна-гуманістычных, вечных хрысціянскіх ісцін, універсальных агульначалавечых каштоўнасцей. У наш час на першы план вылучылася прагматыка ў шырокім сэнсе, у тым ліку і навуковая. Сучаснае цывілізаванае грамадства запатрабавала ў першую чаргу хуткаэфектыўныя навуковыя тэхналогіі, прыкладныя дысцыпліны і метадалогіі, што забяспечваюць аператыўныя матэрыяльна-тэхнічныя вынікі.

У складаным мульцікультурным свеце адбываюцца сацыяльныя зрухі, асіміляцыйныя працэсы. У пастчарнобыльскую эру ўзнікла пагроза знікнення

беларускай мовы, а значыць беларускай культуры, этнаса і народа. У новых умовах павінна ўдакладняцца і карэкціравацца парадыгма гуманітарных навук, у тым ліку і філалагічнай, літаратуразнаўчай. На сучасным этапе актуалізуюцца даследаванні беларускай мовы і літаратуры ў сістэме іншых славянскіх моваў, літаратур і культур. Нягледзячы на шчыльную інфармацыйную запоўненасць сённяшняй сацыякультурнай прасторы, літаратура была і будзе заставацца побач з іншымі відамі мастацтва важным складнікам духоўнага стану грамадства, неадменным чыннікам гуманітарнага развіцця асобы.

Сёння, магчыма, як ніколі раней, неабходна абгрунтаваць самакаштоўнасць беларускага мастацтва, літаратуры, культуры, традыцыйных духоўных каштоўнасцей беларускага народа, без якіх шмат страціць сусветная мульцікультурная прастора. Айчыннаму літаратуразнаўству неабходна засяродзіцца на распрацоўцы ўніверсальнасці катэгорыі сакральнага ў літаратурна-мастацкай прасторы, на асэнсаванні яго аксіялагічнай сутнасці. Беларуская гуманітарная думка, у тым ліку і літаратуразнаўства, яшчэ не выказаліся вычарпальна аб мульцікультуралізме як філасофскай ідэі прапаганды сацыяльнай салідарнасці. У беларускім грамадстве заўсёды пытанні пашырэння функцыянавання роднай мовы і літаратуры, на жаль, штучна палітызаваліся. Пры сённяшнім двухмоўі на Беларусі, пры дамінаванні рускамоўнай прасторы, відавочна, што ідэя мульцікультурнасці павінна мець нацыянальныя варыянты рэалізацыі, асабліва, калі ўлічыць, што беларуская мова сусветнай арганізацыяй ЮНЕСКА аднесена да асуджаных на знікненне нацыянальных моваў. Магчыма, у якасці альтэрнатывы філасофскай ідэі мульцікультуралізму беларускім гуманітарыям варта прапанаваць для рэалізацыі дыскурсы полікультуралізму ці нават дамінантнай беларускакультурнай гегемоніі. Філолагам-літаратуразнаўцам варта звярнуцца на новым навукова-метадалагічным узроўні да малазапатрабаваных у мінулыя дзесяцігоддзі даследчых праектаў літаратура – культура – соцыум, да вывучэння беларускай літаратуры ў сістэме іншых відаў мастацтва, што будзе садзейнічаць актуалізацыі нацыянальных духоўных каштоўнасцяў у сучаснай грамадскай свядомасці. І вельмі важна актыўней і шырэй далучаць студэнцкую моладзь да нацыянальных і агульначалавечых мастацка-культурных здабыткаў, да навукова-гуманітарных даследаванняў, якія маюць для маладых спецыялістаў як прафесійнае так і светапогляднае значэнне – у станаўленні асобы, яе грамадзянскасці і полікультурнасці.

Мяркую, што мы, універсітэцкая супольнасць, адчуваем гэтую і місійнасць, і адказнасць, бо мы рыхтуем педагогаў і ўвогуле маладых спецыялістаў, якія будуць працаваць з будучымі пакаленнямі. Так, 2010 год аб’яўлены ў свеце годам хрысціянскай культуры, аб чым нават нямногія з нас ведаюць. У нас жа – гэта найперш год якасці. Прыйшоў час задумацца, што якасць адукацыі і выхавання звязаны з больш актыўным далучэннем маладога пакалення да вечных хрысціянска-культурных каштоўнасцяў. Аб тым, што гэта вельмі патрэбна нашым студэнтам, сведчаць іх зацікаўленыя адносіны да сустрэч з Алегам Бембелем, філосафам, літаратарам, а зараз кніжнікам-асветнікам інакам Мікалаем з Жыровіцкага манастыра. На маю думку, неабходна больш намаганняў прыкладаць на выхаванне ў нашай моладзі і сямейных каштоўнасцяў, нацыянальных традыцый, яны таксама павінны быць з разраду вечных гуманістычных арыенціраў.

Большасць беларускай моладзі, паводле сацыялагічных апытанняў, адчуваюць і лічаць сябе еўрапейцамі. І нашыя, брэсцкія студэнты не выключэнне. Гэта мудра адчула яшчэ на пачатку новага стагоддзя кіраўніцтва нашага ўніверсітэта, трапна сфармуляваўшы важную, сутнасную ідэю жыццядзейнасці нашай установы – універсітэт на захадзе краіны. Сапраўды, мы здаўна еўрапейская нацыя, здаўна

належым да хрысціянскага свету. Мы ўжо сёння павінны звязваць будучыню нашай моладзі, нашай краіны не толькі з Расіяй, але і з еўрапейскай супольнасцю, найперш еўрапейскім славянствам.

Мы працуем на прафесійнасць сваіх студэнтаў і адначасова на будучыню Беларусі. Яна, несумненна, звязана з паважлівым, гарманічным добрасуседствам з Украінай, Польшчай, Літвой, Расіяй, іншымі дзяржавамі, сапраўды – як вольны з вольным і як роўны з роўным. Суверэнітэт дзяржавы – гэтую найвялікшую каштоўнасць – беларусы ўжо ніколі не страцяць. Але ў масава-побытавай свядомасці існуе ўяўленне, што суверэнітэт Беларусі гарантуецца толькі энергетычна-эканамічнымі складнікамі. Нават мы, універсітэцкая эліта і грамадскасць, не да канца ўсвядомілі важную ісціну, сфармуляваную класікамі, беларускімі мыслярамі XX стагоддзя ад Купалы да Быкава, што галоўная ўмова і вырашальны фактар суверэннасці – нацыянальная ідэя, нацыянальная свядомасць. Менавіта гэтая ідэя здаўна была і застаецца гарантам прагрэсу для соцень нацый свету, у тым ліку самых магутных. Нацыянальная ідэя, культура, мова, нацыянальная канцэпцыя агульнажыцця – вось тое, чым мы, беларусы, цікавы свету.

Беручы ўдзел у многіх міжнародных каферэнцыях, кангрэсах, супрацоўнічаючы з калегамі еўрапейскіх універсітэтаў, я мела магчымасць мноства разоў назіраць: беларускі вучоны, інтэлігент, які сярод еўрапейскіх калег замест роднай, беларускай мовы карыстаецца рускай, выклікае, як правіла, іронію.

Варта, згадваючы наш брэнд, – універсітэт на захадзе краіны – актыўней рэалізоўваць яго сутнасць. Ён перспектыўны, за ім – стратэгічны патэнцыял і навукова-гуманітарная будучыня, на якіх ёсць сэнс засяродзіцца ў нашай дзейнасці. Несумненна, што наша ўніверсітэцкая супольнасць, застаючыся інтэлектуальна-прафесійнай элітай, павінна пашыраць і ствараць новую прастору, духоўна-беларускую, носьбітам якой павінен быць кожны з нас – ад прафесара-кіраўніка да студэнта**.** Нягледзячы на ўзнікненне Палескага ў Пінску і Баранавіцкага ўніверсітэтаў, менавіта Брэст і наш універсітэт быў, ёсць і будзе культурным цэнтрам Палесся. Мяркую, што наша ўстанова павінна ўпэўнена станавіцца навуковым цэнтрам народазнаўства і культуры заходне-палескага рэгіёну Беларусі. У нас у гэтых адносінах многа зроблена, ёсць высокакваліфікаваныя спецыялісты-народазнаўцы, культуролагі.

У сувязі з тым, што мы былі і будзем універсітэтам на захадзе краіны, думаю, нам трэба вярнуць ва ўніверсітэт, на філфак важныя, іміджавыя ўніверсітэцкія спецыяльнасці: паланістыку, украіністыку, магчыма, адрадзіць руска-беларускую спецыяльнасць, падумаць аб беларуска-літоўскай (у нашых народаў шэсць вякоў супольнай гісторыі). Паланістыку і ўкраіністыку зусім слушна эканамісты нашага ўніверсітэта называлі «залатымі» спецыяльнасцямі, маючы на ўвазе іх затратнасць. Але ўсім нам вядома, што ёсць каштоўнасці, якія даражэй за ўсякае грашовае вымярэнне. Гэта якраз той выпадак, калі справа датычыцца даражэйшага – статуснасці, міжнароднага аўтарытэту нашага ўніверсітэта. Прыйшоў час змірыцца з думкай, што на філфаку, як, магчыма, на іншых гуманітарных факультэтах, не будзе шматлюдных студэнцкіх набораў, а будзе, як у многіх еўрапейскіх універсітэтах, філолагаў-славістаў нямнога. Так, напрыклад, у Люблінскім універсітэце, з якім мы маем дамову аб супрацоўніцтве, на другім курсе толькі 5 студэнтаў-беларусістаў, але кіраўніцтва не закрывае беларусістыку.

Думаецца, нам мэтазгодна актыўней дэманстраваць сваю навукова-асветную, універсітэцкую адкрытасць новымі і цікавымі справамі. Наш міжнародны аўтарытэт павінен узрастаць не толькі дамовамі аб супрацоўніцтве з украінскімі, расійскімі, літоўскімі, польскімі універсітэтамі, але найперш канкрэтнай сістэмнай працай: напрыклад, днямі Валынскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Лесі Ўкраінкі ў Брэсцкім

ўніверсітэце імя А.С. Пушкіна, днямі Беластоцкага ўніверсітэта ў нашым Брэсцкім і, адпаведна, днямі Брэсцкага ўніверсітэта ў сваіх партнёраў-універсітэтаў. Замежныя калегі цікавяцца выданнямі, напрацоўкамі вучоных нашага ўніверсітэта. Нам ёсць чым і паганарыцца перад імі. Такое партнёрства, несумненна, дасць пачатак многім сумесным навукова-даследчым праектам і праграмам.

Юбілей, як вядома, нагода не толькі падрахаваць, але і памарыць аб будучыні. Наш універсітэт у апошнія дзесяцігоддзі стаў важным гуманістычна-адукацыйным асяродкам у нашай краіне. Цяжка ўявіць, якім ён будзе праз 20, 50 год, як ацэняць нашыя справы, дасягненні і пралікі наступнікі, што скажуць пра нас. В. Быкаў пісаў: «Жыццё кароткае, і трэба спяшацца рабіць добрыя справы. Не сябе любіць, а бліжняга свайго, чалавека любіць. Каб потым, пасля цябе ўзышла на зямлі зялёная трава памяці. Трава пасля нас».

Усім вам, шаноўным калегам і нашым студэнтам, я жадаю любіць – універсітэт, працу, вучобу, настаўнікаў, студэнтаў, кіраўнікоў і падначаленых, любіць навуку і творчасць, любіць Беларусь.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 03.01.2011